Дзяржаўная  ўстанова адукацыі
“Гальшанская сярэдняя школа”

# Праграма
# рэалізацыі праекта
# “Бацькоўскі ўніверсітэт”
# III ступень — «Маё дзіця — старшакласнік»
# для бацькоў навучэнцаў
# X—XI класаў

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Школа з'яўляецца найважнейшым сацыяльным інстытутам, з якім сям'я ўзаемадзейнічае на працягу ўсяго навучання дзіцяці. Эфектыўнасць адукацыі і выхавання дзіцяці шмат у чым залежыць ад таго, наколькі цесная гэтая сувязь. Патрабаванні сучаснай рэальнасці стымулююць педагогаў авалодваць найноўшымі педагагічнымі тэхналогіямі для выкарыстання іх у сваёй працы, шукаць эфектыўныя формы ўзаемадзеяння з бацькамі. Супрацоўніцтва сям'і і школы ў інтарэсах дзіцяці можа быць паспяховым толькі ў тым выпадку, калі яны стануць саюзнікамі, што дазволіць ім лепш спазнаць дзіця, улічваць індывідуальныя асаблівасці пры развіцці яго здольнасцей, сфарміраваць жыццёвыя арыенціры і каштоўнасныя прыярытэты.

Практыка паказвае, што не ўсе бацькі маюць дастатковы ўзровень ведаў і ўменняў у галіне выхавання і маюць цяжкасці пры развіцці і выхаванні дзіцяці, устанаўленні з ім кантактаў. Бацькі не валодаюць у дастатковай меры ведамі узроставых і індывідуальных асаблівасцей развіцця дзіцяці, часта ажыццяўляюць выхаванне інтуітыўна, што, як правіла, не прыносіць пазітыўных вынікаў. Не заўсёды бацькі разумеюць сваё дзіця. Бацькі могуць слухаць, але не чуць яго, што прыводзіць да складанасцей ва ўзаемаадносінах. У такіх сем'ях часта няма трывалых міжасобасных сувязей паміж бацькамі і дзецьмі і, як следства, «аўтарытэтам» становіцца знешняе, часта негатыўнае асяроддзе, што прыводзіць да «выхаду» дзіцяці з-пад уплыву сям'і.

Педагогам, педагогу сацыяльнаму важна ўсталяваць партнёрскія адносіны з сям'ёй кожнага выхаванца, стварыць атмасферу ўзаемападтрымкі і супольнасці інтарэсаў. На сучасным этапе развіцця сувязным звяном паміж школай і сям'ёй з'яўляюцца спецыялісты сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы. Менавіта ад іх працы залежыць тое, наколькі ў сем'ях разумеюць палітыку, якая праводзіцца школай у адносінах да выхавання, навучання дзяцей, як актыўна ўдзельнічаюць у яе рэалізацыі. Пры гэтым сям'я павінна разглядацца як галоўны заказчык і саюзнік у выхаванні дзяцей, а аб'яднанне намаганняў педагогаў і бацькоў створыць спрыяльныя ўмовы для развіцця навучэнцаў.

## Мэта Бацькоўскага ўніверсітэта —

***павышэнне педагагічнай і псіхалагічнай культуры бацькоў, фарміраванне адказнага, пазітыўнага бацькоўства. Універсітэт педагагічных ведаў для бацькоў павінен спрыяць усталяванню кантактаў бацькоў са школай, узаемадзеянню бацькоў і педагогаў у выхаванні, развіцці і сацыялізацыі дзіцяці.***

### Асноўныя задачы Бацькоўскага ўніверсітэта:

- фарміраванне каштоўнасна-сэнсавых асноў бацькоўства;
- актуалізацыя пачуцця адказнасці за выкананне бацькоўскіх функцый;
- фарміраванне і развіццё псіхолага-педагагічных кампетэнцый бацькоў у галіне сямейнага выхавання (фарміраванне ведаў аб сямейнай псіхалогію, дзіцяча-бацькоўскія адносіны, узроставыя асаблівасці дзяцей, фарміраванне гарманічных сямейных адносін, навыкаў канструктыўнага ўзаемадзеяння з дзецьмі і інш.), садзейнічанне развіццю навыкаў самаадукацыі бацькоў;
- забеспячэнне мэтанакіраванай работы па прафілактыцы сямейнага недабрабыту і сацыяльнага сіроцтва, зніжэнне рызыкі канфліктных сітуацый і крызісных станаў, узнікнення цяжкасцей у сямейным выхаванні, аказанне своечасовай псіхолага-педагагічнай і інфармацыйнай дапамогі сем'ям, якія трапілі ў цяжкую жыццёвую сітуацыю;
- арганізацыя эфектыўнага супрацоўніцтва і партнёрства бацькоў навучэнцаў і ўстановы адукацыі і г. д.

**Мэтавая група** — бацькі (законныя прадстаўнікі) навучэнцаў.

### Напрамкі работы Бацькоўскага ўніверсітэта:

***I. Арганізацыйныя:***

- фарміраванне вочнай і дыстанцыйнай формаў навучання ў Бацькоўскім універсітэце;
- распрацоўка інтэрнэт-сайта Бацькоўскага ўніверсітэта;
- стварэнне ў папулярных сацыяльных сетках («ВКонтакте», «Одноклассники», «Facebook») інтэрнэт-рэсурсаў для размяшчэння інфармацыі аб дзейнасці Бацькоўскага ўніверсітэта (анонс маючых адбыцца сустрэч, інфармацыя аб мінулых сустрэчах, матэрыялы адукацыйнага характару для бацькоў і г. д.).

***II. Інфармацыйна-асветніцкія:***

- прэзентацыя зместу праграмы і мерапрыемстваў Бацькоўскага ўніверсітэта;

- арганізацыя псіхолага-педагагічнай асветы бацькоў па розных аспектах сямейнага выхавання:

  — прававое: аб магчымасцях, правах і абавязках у ажыццяўленні адукацыйных патрэб сям'і;

  — псіхолага-педагагічнае: аб метадах і формах выхавання, навучання дзіцяці;

  — грамадзянскае: аб шляхах развіцця адукацыі, школы.
- кансультаванне бацькоў па юрыдычнай, псіхолага-педагагічнай і іншым праблемах.

***III. Змястоўны:***

- навукова-метадычнае забеспячэнне фарміравання псіхолага-педагагічнай кампетэнтнасці бацькоў у галіне выхавання і развіцця дзяцей з улікам сацыякультурных традыцый, сучасных праблем і асаблівасцей развіцця грамадства;
- пашырэнне выхаваўчага і творчага патэнцыялу бацькоў і сям'і ў цэлым.

Выхаваўчая дзейнасць Бацькоўскага ўніверсітэта будуецца:

- на ацэнцы бацькамі ўласнага жыццёвага вопыту;
- на набыцці новых ведаў з апорай на ўласныя ўнутраныя рэзервы;
- на стабільных зносінах дзяцей і іх бацькоў;
- на фарміраванні атмасферы пошуку новых ведаў;
- на самаўдасканаленні бацькоў праз ўсведамленне імі індывідуальнага погляду на дзіця;
- на развіцці творчых здольнасцей членаў сям'і;
- на ўменні бачыць вынікі развіцця дзяцей;
- на ўменні бачыць цяжкасці і шукаць шляхі іх пераадолення, выстройваць лесвіцу поспеху.

Праца Бацькоўскага ўніверсітэта арганізуецца з улікам заканамернасцей развіцця дзіцяці ў розныя ўзроставыя перыяды па ***трох ступенях:***

**І ступень — «Маё дзіця — малодшы школьнік»** — для бацькоў вучняў І—ІV класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі,

**ІІ ступень — «Маё дзіця — падлетак»** — для бацькоў вучняў V—ІХ класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі,

**ІІІ ступень — «Маё дзіця — старшакласнік»** — для бацькоў вучняў Х—ХІ класаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі.

Прапанаваныя напрамкі будуць спрыяць ўключэнню бацькоў у актыўнае супрацоўніцтва са школай ў вырашэнні праблем сямейнага выхавання. Арганізацыя ўзаемадзеяння з бацькамі навучэнцаў у рамках Бацькоўскага ўніверсітэта дазволіць аб'яднаць намаганні бацькоў,

педагогаў, педагогаў-псіхолагаў, педагогаў сацыяльных і іншых спецыялістаў па арганізацыі канструктыўнага дыялога ў пошуку адказаў на актуальныя пытанні сямейнага выхавання.

## Формы правядзення заняткаў:

- **традыцыйныя** (лекцыі, гутаркі, канферэнцыі, круглыя сталы, дыскусіі, семінары-практыкумы, майстар-класы, псіхалагічныя трэнінгі, індывідуальныя гутаркі і кансультацыі, апытанні бацькоў па рознай тэматыцы, абмен вопытам работы і г. д.);
- **дыстанцыйныя** (вебінары, форумы, online кансультацыі, размяшчэнне інфармацыі па актуальных пытаннях сямейнага выхавання на сайце школы, праца на гарачай лініі ўстановы адукацыі, удзел у стварэнні рэкламных буклетаў, лістовак, афармленне стэндаў, анкетаванне бацькоў, стварэнне і абнаўленне кутка педагога-псіхолага ў кожным класе; прыцягненне бацькоў да ўдзелу ў тэматычных выставах і іншых мерапрыемствах).

## Чакаемыя вынікі работы Бацькоўскага ўніверсітэта:

- фарміраванне ў бацькоў ўсвядомленых адносін да бацькоўства;
- павышэнне цікавасці бацькоў да самаадукацыі;
- задавальненне патрэб сям'і навучэнца ў адукацыйных паслугах: у навучанні, псіхолага-педагагічнай падтрымцы і інш.;
- павышэнне ўзроўню педагагічнай культуры бацькоў;
- актывізацыя бацькоў у вырашэнні сямейных праблем, скарачэнне колькасці няшчасных сем'яў, выпадкаў сямейнага гвалту, памяншэнне колькасці падлеткаў з дэвіянтнымі паводзінамі;
- развіццё ўзаемаразумення, супрацоўніцтва сям'і і ўстановы адукацыі;
- ахоп бацькоўскім усенавучам большасці бацькоў навучэнцаў, дзякуючы сістэме дыстанцыйнага навучання.

***Заняткі Бацькоўскага ўніверсітэта мяркуецца праводзіць адзін раз у чвэрць. Кансультацыі для бацькоў*** праводзяцца ў адпаведнасці з устаноўленым ***графікам.*** Тэматыка заняткаў і кансультацый з бацькамі вызначана з улікам узроставых псіхалагічных асаблівасцей навучэнцаў.

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН РАБОТЫ БАЦЬКОЎСКАГА УНІВЕРСІТЭТА

| № | Назва раздзела, тэмы заняткаў, пералік вывучаемых пытанняў | Тэрміны правядзення | Форма правядзення | Адказныя |
|---|---|---|---|---|
| 1 | ***10 клас*** | | | |
| 1.1 | *Тэма 1. Здароўе — гэта жыццё.* Фактары рызыкі для здароўя сучаснай моладзі. Праблема здаровага харчавання. Захапленне дыетамі. Гіпадынамія — праблема сучасных маладых людзей. Стрэс і яго ўплыў на здароўе. Шкодныя звычкі. Захаванне здароўя і правілы здаровага ладу жыцця. Рэжым дня | Верасень | Лекцыя/ гутарка/ семінар-практыкум/ вебінар | Маляўка Т.А. |
| 1.2 | *Тэма 2. Першае каханне ў жыцці вашага дзіцяці.* Асаблівасці юнацкай любові. Культура паводзін закаханых. Як дапамагчы, а не нашкодзіць дзіцяці, якое становіцца дарослым | Лістапад | Круглы стол/ дыскусія/ форум/ майстар-клас | Маляўка Т.А. |
| 1.3 | *Тэма 3. Роля сям'і ў фарміраванні рэпрадуктыўнага здароўя юнакоў і дзяўчат.* Рэпрадуктыўнае здароўе юнакоў і дзяўчат. Фактары рызыкі для рэпрадуктыўнага здароўя. Умовы захавання рэпрадуктыўнага здароўя. Адносіны паміж юнакамі і дзяўчатамі, любоў і сэксуальныя адносіны. | Люты | Гутарка/ круглы стол/ вебінар | Маляўка Т.А. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | Рызыкоўныя паводзіны моладзі. Незапланаваная цяжарнасць і аборт. Прафілактыка захворванняў, якія перадаюцца палавым шляхам.<br>Стыль жыцця і рэпрадуктыўнае здароўе моладзі. Уплыў сямейнага выхавання на фарміраванне ў падлеткаў каштоўнасці рэпрадуктыўнага здароўя | | | |
| 1.4 | *Тэма 4. Як дапамагчы старшакласніку стаць упэўненым у сабе?*<br>Уплыў сарамлівасці і няўпэўненасці на вучэбныя поспехі старшакласніка. Шляхі пераадолення сарамлівасці і няўпэўненасці старшакласніка дома і ў школе | Красавік | Круглы стол/ дыскусія/ псіхалагічны трэнінг, вебінар | Маляўка Т.А. |
| 2 | ***11 клас*** | | | |
| 2.1 | *Тэма 1. Як дапамагчы старшакласніку ў прафесійным самавызначэнні?*<br>Вызначэнне прафесійных схільнасцей і здольнасцей старшакласнікаў. Фактары, якія ўплываюць на выбар прафесіі. Роля бацькоў у працэсе выбару прафесіі і самавызначэнні старшакласніка.<br>Прыярытэты старшакласнікаў у выбары прафесіі. Прафесійныя дынастыі.<br>Дапамога старшакласнікам ў выбары будучай прафесіі | Кастрычнік | Семінар-практыкум/ форум/ вебінар | Каралевіч І.В. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.2 | *Тэма 2. Як зберагчы дзіця ад залежнасцей?* Залежныя паводзіны, яго прычыны, фактары рызыкі. Фарміраванне залежнасці. Віды пагроз, якія ўяўляюць небяспеку для жыцця, фізічнага, псіхічнага і маральнага здароўя і паўнавартаснага развіцця старшакласніка. Інтэрнэт-залежнасць. Шляхі прафілактыкі і пераадолення: памятка для бацькоў | Снежань | Канферэнцыя/ гутарка/ практыкум | Каралевіч І.В. |
| 2.3 | *Тэма 3. Падрыхтоўка старшакласнікаў да будучага сямейнага жыцця.* Выхаванне старшакласніка як будучага сем'яніна. Фарміраванне ўсвядомленага стаўлення да ўступлення ў шлюб і будучага сямейнага жыцця. Фарміраванне каштоўнасных адносін да бацькоўства, нараджэння і выхавання дзяцей. Роля сямейных узаемаадносін і традыцый у падрыхтоўцы старшакласнікаў да сямейнага жыцця | Сакавік | Круглы стол/ дыскусія/ форум/ вебінар | Каралевіч І.В. |
| 2.4 | *Тэма 4. Як дапамагчы дзіцяці ў перыяд падрыхтоўкі да іспытаў?* Прафілактыка экзаменацыйнага стрэсу. Фактары, якія ўзмацняюць і якія зніжаюць трывогу. Як дапамагчы старшакласніку справіцца з трывогай (мнематэхнікі, прыёмы | Май | Семінар-практыкум/ майстар-клас/ псіхалагічны трэнінг | Каралевіч І.В. |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | канцэнтрацыі ўвагі і прыёмы расслаблення ў стрэсавай сітуацыі). Супрацоўніцтва бацькоў і педагогаў у перыяд падрыхтоўкі старшакласнікаў да іспытаў. Дапамога ў падрыхтоўцы да іспытаў: правілы для бацькоў выпускнікоў. Рэжым вучэбнай працы і адпачынку ў экзаменацыйны перыяд | | | |

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА КАНСУЛЬТАЦЫЙ

для бацькоў вучняў X—XI класаў

| **Клас** | **Тэмы кансультацый для бацькоў** | **Адказныя** |
|---|---|---|
| 10 | Псіхафізіялагічныя асаблівасці дзесяцікласнікаў.<br>Самавыхаванне старшакласнікаў як умова маральнага выхавання.<br>Асабістае ці гэта справа-асабістае шчасце?<br>Фарміраванне сямейна-шлюбных каштоўнасцей старшакласнікаў.<br>Выхаванне маральнага ідэалу, духоўнага свету старшакласнікаў.<br>Кім быць і якім быць?<br>Арганізацыя вольнага часу старшакласнікаў.<br>Асаблівасці здароўя і фізічнага развіцця старшакласніка.<br>Рэжым вучэбнай і фізічнай працы, асабістая гігіена | Класны кіраўнік, педагог сацыяльны, педагог-псіхолаг |
| 11 | Цяжкасці асобаснага росту і іх уплыў на навучанне.<br>Навуковая арганізацыя вучэбнай працы старшакласнікаў.<br>Роля тэатра, кіно і тэлебачання ў фарміраванні эстэтычных ідэалаў у старшакласнікаў.<br>Закон і адказнасць непаўналетніх.<br>Фарміраванне здаровага ладу жыцця.<br>Фізічная дасканаласць, гатоўнасць старшакласнікаў да працы, ваеннай службы.<br>Самарэалізацыя асобы | Класны кіраўнік, педагог сацыяльны, педагог-псіхолаг |

## РЭКАМЕНДУЕМАЯ ЛІТАРАТУРА

1 *Андреева, Т. В.* Психология семьи : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений, обучающихся по направлению и по специальностям психологии / Т. В. Андреева. — 3-е изд., перераб. и доп. — СПб. : Питер Пресс, 2014. — 334 с.

2 *Вержибок, Г. В.* Гендерное воспитание в семье и школе : Г. В. Вержибок ; под ред. А. С. Лаптенка. — Минск : Национальный институт образования, 2016. — 248 с.

3 *Глинский, А. А.* Воспитание гражданина, труженика, семьянина : пособие для педагогических работников учреждений общ. сред. образования / А. А. Глинский, А. Ф. Журба. — Минск : Национальный институт образования, 2018. — 232 с.

4 *Залыгина, Н. А.* Педагогическое взаимодействие с родителями учащихся, требующих повышенного внимания : пособие для педагогов учреждений образования, реализующих образовательные программы общего среднего образования, специальных учебно-воспитательных учреждений, специального лечеб.-воспит. учреждения / Н. А. Залыгина, М. Е. Минова. — Минск : Национальный институт образования, 2019. — 192 с.

5 *Кабуш, В. Т.* Гуманизация воспитательного процесса в современной школе : пособие для педагогов общ. сред. образования / В. Т. Кабуш, А. В. Трацевская. — Минск : Национальный институт образования, 2012. — 184 с.

6 *Катович, Н. К.* Формы и методы взаимодействия семьи и школы : пособие для педагогов учреждений общ. сред. образования / Н. К. Катович, Т. П. Елисеева. — Минск : Национальный институт образования, 2011. — 208 с.

7 *Козлова, Г. Л.* Безопасность детей в опасном мире : практическое пособие / Г. Л. Козлова, Л. Н. Мирейчик, М. В. Пряхина. — Минск : Альтиора. ― Живые краски, 2013. — 55 с.

8 Концепция непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи: постановление Министерства образования Респ. Беларусь, 15.07.2015, № 82 [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http:// adu.by/.../koncept-vospit-detej-i-molodioji.doc. — Дата доступа : 29.09.2019.

9 *Кулагина, И. Ю.* Психология развития и возрастная психология : полный жизненный цикл развития человека / И. Ю. Кулагина, В. Н. Колюцкий. — М. : Академический проект ; Трикста, 2011. — 419 с.

10 *Левченко, А. О.* Дети онлайн : опасности в сети / А. О. Левченко. — М. : Изд-во «Э», 2015. — 320 с.

11 *Луговцова, Е. И.* Психология формирования культуры здорового образа жизни школьников : пособие для педагогов-психологов, педагогов социальных учреждений общ. сред. образования / Е. И. Луговцова. — Минск : Национальный институт образования, 2012. — 190 с.

12 *Мартынова, В. В.* Профилактика правонарушений учащихся : пособие для педагогов учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. языками обучения / В. В. Мартынова, Е. К. Погодина, Д. О. Донченко. — Минск : Национальный институт образования, 2019. — 192 с.

13 *Мартынова, В. В.* Социально-педагогические основы патронатного воспитания : пособ**ие для специалистов управлений образования, органов охраны детства, социальных педагогов / В. В. Мартынова, А. М. Русецкая, В. И. Вашнева. — Минск :** Национальный институт образовани**я, 2011. — 160 с.**

14 *Мартынова, В. В.* Социально-педагогическая работа с семьей : пособие для социальных педагогов учреждений образования, специалистов органов управления образованием / В. В. Мартынова, А. Н. Ходосок. — Минск : Национальный институт образования, 2010. — 216 с.

15 *Медведская, Е. И.* Ребенок в мире мультимедиа : предупреждение зависимости / Е. И. Медведская. — Минск : Народная асвета, 2018. — 192 с.

16 *Недвецкая, М. Н.* Теория и практика организации педагогического взаимодействия школы и семьи / М. Н. Недвецкая. — М. : УЦ Перспектива, 2011. — 152 с.

17 *Некрасова, З. В.* Как оттащить ребенка от компьютера и что с ним потом делать : пособие для родителей / Заряна и Нина Некрасовы. — 2-е изд., доп. — М. : Академический проект, 2017. — 254 с.

18 ***Ничишина, Т. В.*** **Профилактика девиантного поведения несовершеннолетних в школе и семье** / Т. В. Ничишина. — Минск : Национальный институт образования, 2018. — 248 с.

19 *Овчарова, Р.В.* Психология сопровождения родительства /Р. В. Овчарова. — М.: Академия, 2005. — 368 с.

20 *Овчарова, Р. В.* Родительство как психологический феномен : учеб. пособие / Р. В. Овчарова. — М. : Московский психолого-социальный институт, 2006. — 496 с.

21 *Окулич, Н. А.* Как стать успешным родителем : пособие для педагогов учреждений общ. сред. образования / Н. А. Окулич ; под ред. М. П. Осиповой. — Минск : ИВЦ Минфина, 2015. — 192 с.

22 *Осипова, М. П.* Педагогическое взаимодействие с семьей : пособие для педагогов учреждений общ. сред. образования / М. П. Осипова, Е. Д. Осипов. — Минск : ИВЦ Минфина, 2015. — 189 с.

23 *Первушина, Е. В.* Выжить в начальной школе. Как? : книга для умных родителей / Е. В. Первушина. — СПб. : Вектор, 2010. — 251 с.

24 *Петрановская, Л.* Тайная опора. Привязанность в жизни ребенка / Л. Петрановская. — М. : АСТ, 2015. — 210 с.

25 *Погодина, Е. К.* Модель организации деятельности специалистов социально-педагогической и психологической службы по оказанию психолого-педагогической помощи семьям в воспитании детей / Е. К. Погодина // Повышение качества профессиональной подготовки специалистов социальной и образовательной сфер : сб. науч. статей, Витебск, 2020 г. / Вит. гос. ун-т ; редкол. : Е. Л. Михайлова, С. Д. Матюшкова, С. Г. Туболец / науч. ред. Е. Л. Михайлова ; отв. за выпуск С. А. Моторов. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2020. — 238 с.

26 *Погодина, Е. К.* Психолого-педагогическая поддержка семьи в воспитании детей / Е. К. Погодина // Образование. Наука. Культура : материалы междунар. науч. форума (20 ноября 2019 г.). В 5 ч. Ч. 2. Междунар. науч.-практ. конференция «Педагогика и психология в современной системе образования» : сб. науч. статей / отв. ред. Н. В. Осипова. — Гжель : ГГУ, 2020. — 548 с. — С. 393—394.

27 *Погодина, Е. К.* Теория и практика социально-педагогической работы с семьей : учеб.-метод. пособие / Е. К. Погодина, С. Г. Туболец. — Минск : БГПУ, 2019. — 160 с.

28 *Погодина, Е. К.* Формирование психолого-педагогической компетентности родителей учащихся / Е. К. Погодина // Вестник Шадринского государственного педагогического университета. — 2019. — № 4 (44). — С. 130—132.

29 Программа непрерывного воспитания детей и учащейся молодежи на 2016—2020 гг. : постановление Министерства образования Респ. Беларусь, 22.02.2016, № 9 [Электронный ресурс]. — Режим доступа :

http://http://mp.minsk.edu.by/main.aspx?guid=6581. — Дата доступа : 29.09.2019.

30 Психология семейных отношений с основами семейного консультирования : учеб. пособие для студ. высш. учеб. заведений / Е. И. Артамонова, Е. В. Екжанова, Е. В. Зырянова и др. ; под ред. Е. Г. Силяевой. — М. : Издательский центр «Академия», 2005. — 192 с.

31 *Урбанович, Л. Н.* Нравственные основы семьи и брака. Система работы со старшеклассниками и родителями : метод. рекомендации, разработки занятий, тесты, анкеты, психологические практикумы [Методическое пособие с электронным приложением] / Л. Н. Урбанович. — М. : Глобус, 2009. — 256 с.

32 Формирование культуры семейных отношений : из опыта работы специалистов социально-педагогической и психологической службы учреждений образования Витебской области : методико-практические материалы. — Витебск : ГУДОВ «ВО ИРО», 2017. — 51 с.

33 Формирование семейных ценностей : игры и тренинги для учащихся и родителей / сост. Г. Г. Моргулец. — Волгоград : Учитель, 2011. — 183 с.

34 *Фурманов, И. А.* Психолого-педагогическая профилактика семейного неблагополучия : пособие для педагогов и психологов общеобразовательных, социально-педагогических учреждений, учреждений дошкольного образования / И. А. Фурманов. — Минск : Национальный институт образования, 2010. — 176 с.

35 *Хилько, М. Е.* Возрастная психология : краткий курс лекций / М. Е. Хилько, М. С. Ткачева. — 2-е изд., перераб. и доп. — М. : Юрайт, 2016. — 198 с.

36 *Целуйко, В. М.* Родители и дети : психология взаимоотношений в семье / В. М. Целуйко. — 2-е изд. — Мозырь : Содействие, 2007. — 222 с.

37 *Чечет, В. В.* Педагогика семейного воспитания / В. В. Чечет. — Мозырь : Белый ветер, 2003. — 292 с.

38 *Шнейдер, Л. Б.* Семейная психология : Антология / Л. Б. Шнейдер. — М. : Академический Проект; Трикста, 2010. — 720 с.